**Матырка, В.** БМД на пастаменце / В. Матырка // Лепельскі край. — 2013. — 15 кастр. — С. 2.

## БМД НА ПАСТАМЕНЦЕ

*Вёска Заслонава ў чарговы раз прыцягнула ўвагу лепяльчан і іншых гасцей. Нагодай на гэты раз стала адкрыццё памятнага знака ў гонар афіцэраў і салдатаў Савецкай арміі, якія выконвалі інтэрнацыянальны абавязак. Нагадаем, што некалькі гадоў таму там намаганнямі мясцовых арганізацый «Беларускі саюз афіцэраў» і «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» ужо быў устаноўлены памятны знак. Помнік уяўляў сабой чорную гранітную пліту з надпісам.*

Нядаўна ідэя помніка атрымала далейшае развіццё і ўвасабленне – на паўнавартасны пастамент з валуноў паднята баявая машына дэсанта – грозная тэхніка, якая і зараз стаіць на ўзбраенні мабільных сіл. Ад задумы ўстанавіць баявую адзінку на пастамент да канчатковай рэалізацыі праекта прайшло каля двух гадоў. Ідэя заслонаўскіх ветэранаў была падтрымана кіраўніцтвам раёна, знайшла водгук у камандаванні Міністэрства абароны Беларусі. Як сказаў на цырымоніі адкрыцця помніка старшыня заслонаўскай арганізацыі «Беларускі саюз афіцэраў» Віталь Франчук, вельмі пасадзейнічаў высакароднай справе ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны асабіста Міністр абароны генерал-лейтэнант Юрый Жадобін. Баявая машына дэсанта, устаноўленая на пастаменце, мае нумар 103. Гэтым увекавечаны баявы нумар славутай 103-й Віцебскай гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі, якая амаль у поўным складзе ваявала на спякотнай афганскай зямлі. Шмат ураджэнцаў Лепельшчыны служылі дэсантнікамі.

На адкрыцці помніка прысутнічалі амаль усе, хто ў свой час паспрыяў высакароднай справе. З кароткімі прамовамі, акрамя Віталя Франчука, выступілі камандзір 19-й гвардзейскай механізіраванай брыгады палкоўнік Мікалай Міклашэвіч, старшыня раённай арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане» Сяргей Крывель.

Урачыстасці супалі з яшчэ адной важнай датай – у гэтыя дні святкуецца Дзень 19-й гвардзейскай Чырвонасцяжнай механізаванай Мікалаеўска-Будапешцкай ордэна Суворава другой ступені брыгады – 75-годдзе з часу фарміравання. І хаця брыгада ў вайне ў Афганістане ўдзелу не прымала, усё ж яна прайшла славуты баявы шлях. На ўрачыстай частцы свята ў Доме афіцэраў было сказана шмат цёплых слоў. Завяршыліся мерапрыемствы святочным канцэртам артыстаў мастацкай самадзейнасці.

**Васіль МАТЫРКА**